ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык сектара культуры
Мастоўскага райвыканкама
А.В.Палуйчык
«25» студзеня 2023 г.

# Патрыятычны праект
# “Гонар маёй вёскі”

Масты, 2023

Патрыятычны праект “Гонар маёй вёскі”. [Тэкст] / ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”, аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці; [складальнік Ю.С. Райдзюк, рэдактар В.А. Коршун; адказны за выпуск Т.І. Стэльмах]. – Масты: ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”, 2023 . – 9 с.

*Край любімый, край Мастоўскі, край дзядоў нашых, бацькоў. Любім мы цябе так шчыра ўсім сэрцам і душой!*
*Н.Шэўчык*

## АКТУАЛЬНАСЦЬ ТЭМЫ

Краязнаўства – гэта сувязнае звяно мінулага, сучаснага і будучага. Яно з'яўляецца не толькі крыніцай рознабаковых ведаў пра жыццё краіны, рэгіёна або горада, але і вытокам патрыятызму.

Неабходнасць развіцця інтарэсаў у галіне краязнаўства звязана з сацыяльным заказам грамадства: чым паўней, глыбей, змястоўней будуць веды аб родным краі і яго людзях, тым больш дзейснымі апынуцца яны ў выхаванні любові да роднай прыроды і зямлі, павагі да традыцый свайго народа і патрыятызму.

Кожны чалавек павінен ведаць гісторыю родных мясцін, культурныя традыцыі свайго краю, вядомых землякоў і суайчыннікаў, якія шмат зрабілі дзеля Бацькаўшчыны. А ведаць – гэта значыць цаніць і шанаваць, ганарыцца і будзіць годнасць, пачуццё патрыятызму, без якога няма асобы.

Пачуццё любові да Радзімы трэба клапатліва ўзгадоўваць, прывіваць духоўную аселасць і калі не будзе каранёў у роднай мясцовасці – будзе шмат людзей, падобных на высушаную расліну “Перакаці-поле”.

Краязнаўства – гэта жыццёвая неабходнасць, жаданне захаваць для нашчадкаў веды, гісторыю, традыцыі, якія збліжаюць людзей розных пакаленняў.

Можна зрабіць выснову, што патрыятызм – гэта краязнаўства, а краязнаўства – гэта краялюбіе.

Патрыятызм павінен будавацца на выхаванні ў моладзі любові да Радзімы, гонару за слаўнае мінулае і сучаснасць сваёй Айчыны. Любоў да Радзімы пачынаецца з любові да сваёй малой радзімы, да месца, дзе чалавек нарадзіўся. Каб любіць і ганарыцца сваёй малой радзімай, трэба вывучыць яе гісторыю, традыцыі і славутасці.

## АБГРУНТАВАННЕ ПРАЕКТА

Патрыятызм з’яўляецца найважнейшай маральнай якасцю чалавека і ўключае ў сябе паважлівыя адносіны да роднай мовы; замілаванне да тых мясцін, дзе чалавек нарадзіўся і вырас; грамадзянскія пачуцці; гонар за

сацыяльныя і культурныя дасягненні Радзімы; павагу да гістарычнага мінулага сваей краіны і атрыманых у спадчыну традыцый.

Бібліятэка – інфармацыйны цэнтр, са сваімі краязнаўчымі фондамі і картатэкамі, у якіх сістэматызуюцца і зберагаюцца звесткі пра край. І каб паўней задаволіць запыты чытачоў, супрацоўнікі бібліятэкі стараюцца як мага паўней адлюстраваць краязнаўчую літаратуру ў фондзе і давясці яе да кожнага, хто мае ў гэтым патрэбу.

Патрыятычна праект “Гонар маёй вёскі” грунтуецца на далучэнні дзяцей і дарослых да ўсебаковага вывучэння сваёй малой радзімы, адраджэнню рэгіянальных культурных традыцый, захаванню гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы і краіны.

Праект дапаможа сістэматызаваць краязнаўчую работу, зрабіць яе больш мэтанакіраванай і якаснай.

## 1. Агульныя палажэнні

- Патрыятычны бібліятэчны праект “Гонар маёй вёскі” (далей – Праект) праводзіцца ў рамках Года міру і стварэння і рэспубліканскага конкурсу на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі;
- Арганізатарам Праекта з’яўляецца ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”;
- Асноўным выканаўцам Праекта з’яўляецца ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”;
- Праект прадугледжвае ўдзел мясцовых краязнаўцаў;
- Каардынацыю работы па рэалізацыі Праекта ажыццяўляе аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”.

## 2. Галоўная мэта Праекта

- Адраджэнне і захаванне гістарычнай спадчыны, найбольш поўнае і якаснае накапленне краязнаўчых рэсурсаў у бібліятэцы, іх рацыянальнае выкарыстанне для задавальнення інфармацыйных патрэб насельніцтва;
- Пашырэнне інтарэса да краязнаўчых матэрыялаў і твораў аўтараў-землякоў;
- Актывізацыя краязнаўчай работы бібліятэкі, стварэнне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў;
- Збор звестак аб гісторыі і сённяшнім дні Мастоўскага раёна ў адзіны масіў.

## 3. Асноўныя задачы Праекта

- Распаўсюджванне інфармацыі аб краязнаўчых і мясцовых дакументах, краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва, а таксама рэкламаванне краязнаўчых збораў і інфармацыйных магчымасцей бібліятэк;
- Вывучэнне культурнай спадчыны, фальклору, народных традыцый і звычаяў, духоўнага адраджэння;
- Камплектаванне бібліятэчнага фонду літаратурай краязнаўчага характару;
- Правядзенне раённага конкурсу відэапрэзентацый "Гонар маёй вёскі" на лепшы краязнаўчы матэрыял аб сваёй малой радзіме;
- Забеспячэнне доступу да краязнаўчай інфармацыі;
- Прапаганда літаратуры краязнаўчага характару, фарміраванне аблічча бібліятэкі як месца, дзе кожны жыхар зможа знайсці дапамогу і падтрымку ў пытаннях, якія тычацца малой радзімы;
- Абнаўленне краязнаўчых матэрыялаў на сайце ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка";
- Сістэматызацыя краязнаўчых ведаў у адзіны інфармацыйны рэсурс;
- Стварэнне інтэрактыўнага інфармацыйнага рэсурсу "Гонар маёй вёскі";
- Стварэнне спрыяльных умоў для заняткаў, зносін і правядзення вольнага часу чытачоў.

## 4. Аб'екты ўплыву:

1. Дзеці.
2. Падлеткі.
3. Юнацтва.
4. Дарослае насельніцтва.

## 5. Асноўныя напрамкі і механізм рэалізацыі праекта

- Збор і сістэматызацыя краязнаўчых матэрыялаў аб гісторыка-культурнай, літаратурнай і этнаграфічнай спадчыне роднага краю;
- Правядзення раённага конкурсу відэапрэзентацый "Гонар маёй вёскі" на лепшы краязнаўчы матэрыял аб сваёй малой радзіме;
- Папаўненне новымі матэрыяламі краязнаўчыя картатэкі і краязнаўчыя базы даных "Сцежкамі Мастоўскага краю" і "Літаратурная карта Мастоўскага раёна";

- Стварэнне інтэрактыўнага інфармацыйнага рэсурсу “Гонар маёй вёскі” і размяшчэнне яго на сайте ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”;

## 6. Этапы рэалізацыі Праекта

- Падрыхтоўчы этап (распрацоўка, узгадненне, зацвярджэнне плана дзеянняў па арганізацыі Праекта, распрацоўка палажэння раённага конкурсу відэапрэзентацый “Гонар маёй вёскі”);
- Практычная частка (збор і сістэматызацыя краязнаўчых матэрыялаў, распрацоўка відэапрэзентацый пра славутасці родных мясцін, або таленавітых землякоў, правядзенне асноўных мерапрыемстваў у адпаведнасці з працоўным планам рэалізацыі Праекта);
- Абагульняючы этап (Стварэнне інтэрактыўнага інфармацыйнага рэсурсу **“Гонар маёй вёскі”**).

## 7. Працоўны план рэалізацыі Праекта

***Фарміраванне фонда, інфармацыйных рэсурсаў, інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў.***

| № п/п | Змест мерапрыемства | Тэрмін | Выканаўца |
|---|---|---|---|
| 1 | Мэтанакіравана камплектаваць фонд бібліятэк матэрыяламі аб гісторыі Мастоўшчыны | 2023 г. | аддзел фарміравання бібліятэчнага фонду |
| 2 | Сачыць за публікацыямі краязнаўчага характару ў перыядычным друку | 2023 г. | Кавалеўская І.З., Рабецкая А.С., бібліёграфы аддзела абслугоўвання і інфармацыі |
| 3 | Вывучэнне і сістэматызацыя матэрыялу аб жыцці і дзейнасці славутых землякоў | 2023 г. | Кавалеўская І.З., бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі |
| 4 | Распрацоўка праекта і палажэння раённага конкурсу відэапрэзентацый “Гонар маёй вёскі” | Люты 2023 г. | аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці |
| 5 | Збор і сістэматызацыя краязнаўчых матэрыялаў пра родны край і яго славутасці. | Люты – май 2023г. | Супрацоўнікі ДУК “Мастоўская райнная бібліятэка” |
| 6 | Збор вершаў паэтаў роднага краю. | Люты – май 2023г. | аддзел абслуговання і інфармацыі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7 | Распрацоўка відэапрэзентацый на раённы конкурс "Гонар маёй вёскі":<br><br>"Няхай слава землякоў гучыць над родным краем"<br>"Хараство роднага краю"<br><br>"У сэрцах нашых памяць"<br><br>"Лёс яўрэйскага насельніцтва аг.Лунна ў гады Вялікай Айчыннай вайны"<br>" Мара Кандратовіча"<br><br>"Таленты роднай зямлі. Алег Атаманаў"<br>"Гонар маёй вёскі"<br><br>" Вёсачка - мая чараўнічка"<br><br>"Сем цудаў аграгарадка Масты Правыя"<br>"Мая Рагозніца"<br><br>"Радком сваім яна край праславіла"<br>"Яго іменем названа вуліца" | 2023 г.<br><br><br>чэрвень<br><br>верасень<br><br>чэрвень<br><br>чэрвень<br><br><br>жнівень<br><br>ліпень<br><br>жнівень<br><br>жнівень<br><br>верасень<br><br>верасень<br><br>ліпень<br><br>ліпень | <br><br><br>філіял "Гудзевіцкая сельская бібліятэка"<br>філіял "Дубненская сельская бібліятэка"<br>філіял "Зарудаўеўская сельская бібліятэка"<br>філіял "Лунненская сельская бібліятэка"<br><br>філіял "Мікелеўшчынская сельская бібліятэка"<br>філіял "Мілявіцкая сельская бібліятэка"<br>філіял "Пацавіцкая сельская бібліятэка"<br>філіял "Пескаўская сельская бібліятэка"<br>філіял "Правамастоўская сельская бібліятэка"<br>філіял "Рагозніцкая сельская бібліятэка"<br>філіял "Стралецкая сельская бібліятэка"<br>філіял "Харціцкая сельская бібліятэка" |
| 8 | Папаўненне новымі матэрыяламі краязнаўчай базы даных "Сцежкамі Мастоўскага краю" | Люты-май 2023 г. | Коршун В.А., метадыст аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці |
| 9 | Папаўненне новымі матэрыяламі краязнаўчай базы даных "Літаратурная карта Мастоўскага раёна" | Люты-май 2023 г. | Кавалеўская І.З., бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі |
| 10 | Распрацоўка забаўляльнага кантэнту: віктарын, пазлаў, | Чэрвень - жнівень 2023 г. | Саўко В.Г., адміністратар сістэмны |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | крыжаванак, на аснове краязнаўчага матэрыялу | | |
| 11 | Распрацоўка інтэрактыўнага інфармацыйнага рэсурсу “Гонар маёй вёскі” і размяшчэнне яго на сайте ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка” | Верасень 2023г. | Райдзюк Ю.С., загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці |

***Метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне***

| **№ п/п** | **Змест мерапрыемства** | **Тэрмін** | **Выканаўца** |
|---|---|---|---|
| 1 | Выяўленне і абагульненне вопыту краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі | 2023 г. | Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка” |
| 2 | Арганізацыя асвятлення ходу рэалізацыі Праекта ў сродках масавай інфармацыі і на сайце ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка” | 2023 г. | Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка” |

## 8. Чакаемыя вынікі

Рэалізацыя мерапрыемстваў, прадугледжаных Праектам, стане важным інструментам захавання і развіцця гісторыка-культурнай, літаратурнай і этнаграфічнай спадчыны роднага краю.

Праект дапамагае скласці адзіны вобраз тэрыторыі, паказаўшы яго унікальныя, непаўторныя рысы, пазначыўшы важнасць захавання яе культурнай і прыроднай спадчыны.

У апошні час шырокую папулярнасць сталі набіраць інтэрактыўныя тэхналогіі. Падобная гульнёвая ці забаўляльная тэхналогія можа гарманічна спалучацца з любым краязнаўчым матэрыялам і павысіць да яго цікавасць.

Вынік дадзенага Праекта – станаўленне бібліятэчнай установы як цэнтра маральных, духоўных, культурных зносін, цэнтра адраджэння нацыянальнай культуры і традыцый Мастоўшчыны.

**Вынік Праекта прадугледжвае:**

- Павышэнне іміджу бібліятэкі;
- Удасканаленне патрыятычнага выхавання;
- Стварэнне фонду мультымедыйных прадуктаў краязнаўчай тэматыкі;
- Павышэнне ўзроўню даступнасці краязнаўчых рэсурсаў за кошт укаранення новых інфармацыйных тэхналогій;
- Павышэнне ўзроўню краязнаўчых ведаў мастаўчан, развіццё цікавасць да чытання краязнаўчай літаратуры, твораў аўтараў-землякоў;
- Павелічэнне колькасці віртуальных наведванняў;
- Умацаванне сувязяў бібліятэкі з установамі і арганізацыямі, зацікаўленымі ў распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.